1956 на Бел. радыё, з 1957 у час. «Бярозка», з 1959 літ. кансультант Саюза пісьменнікаў Беларусі, з 1960 рэд. час. «Вясёлка». У 1973—74 адказны



*С.І.Грахоўскі.*

сакратар К-та па Дзярж. прэміях Беларусі ў галіне л-ры, мастацтва і архітэктуры. У паэзіі Г. ў цесным сінтэзе суіснуюць лірычны, эпічны і публіцыст. пачаткі, спавядальныя інтанацыі спалучаюцца з філас. роздумам, з дыдактычнай высновай («Дзень нараджэння», 1958, «Чаканне», 1960, «Памяць», 1965, «Вершы», 1968, «Зазімак», 1976, «Зачараванасць», 1978, «І радасць і боль», 1988, «Недапісаная кніга», 1996). Аўтар зб-каў апавяданняў «Які вялікі дзень» (1966), «Гарачае лета» (1974), «Сустрэча з самім сабою» (1988), аповесці «Рудабельская рэспубліка» (1967; паст., 1968, экранізацыя, 1972), «Суровая дабрата» (1977), кнігі ўспамінаў «Так і было» (1986), «Споведзь» (1990), зб-кі вершаў і апавяданняў для дзяцей. Дамінантамі ва ўсіх творах пісьменніка выступаюць дабрыня, святло, душэўная шчодрасць. На бел. мову пераклаў творы Ж.Верна, Р.Тагора, Я.Райніса, А.Гайдара, А.Блока, М.Дудзіна, С.Ясеніна, Л.Украінкі, У.Маякоўскага і інш. У 1936 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1955.

*Тв.*: Выбр. творы. Т. 1—2. Мінск, 1994.

*Літ.*: Б а р а в і к о в а Р. На грудку ў галавах пасадзіце шыпшыну... // Маладосць. 2008. №9; Б е л ь с к і А.І. Галасы і вобразы: літ.-крыт. артыкулы. Мінск, 2008. *Т.К.Грамадчанка.*

**ГРАЧАНІКАЎ** Анатоль Сямёнавіч (8.9.1938, в. Шарпілаўка Гомельскага р-на — 7.3.1991), беларускі пісьменнік. Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1960), Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1969). З 1969 у газ. «Літаратура і мастацтва», з 1971 нам.



*А.С.Грачанікаў.*

старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гал. рэд. час. «Вясёлка» (з 1976), «Бярозка» (з 1978), «Маладосць» (з 1982). Аўтар зб-каў «Магістраль» (1964), «Круглая плошча» (1971), «Начная змена» (1975), «Верасень» (1984), «Жнівень — 45» (1990) і інш. Пісаў для дзяцей: кн. «Жывая вада» (1985), «Зорны палёт» (1988), «Казка пра Івана-ганчара і пачвару цара» (1980), «Палессе», «Валерка і лятаючая талерка» (абедзве 1983). Аўтар кн. сатыры і гумару «Школа танцаў» (1988). Творчасці Г. ўласцівы шырокі жанрава-тэматычны дыяпазон, засяроджанасць на праблемах мінуўшчыны і сучаснасці. Перакладаў з рус., укр., малдаўскай, літоўскай і інш. моў, выступаў з крыт. артыкуламі. Асобныя яго вершы пакладзены на музыку. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1974. Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

*Тв.*: Калі далёка ты...: выбр. лірыка. Мінск, 1979; Я вас люблю...: лірыка. Мінск, 1986; Выбранае. Мінск, 1988.

*Літ.*: Сожскі карагод: нарысы. Гомель, 2010; Б а р а н о ў с к і А. Гуманістычны характар творчасці Анатоля Грачанікава // Полымя. 2011. № 11. *І.М.Гоўзіч.*

**ГРАЧАНІКІ**, вырабы з грэцкай мукі. З рэдкага цеста пяклі бліны-Г., якія змазвалі тоўчаным канапляным семем. На блясе выпякалі таксама бабкі-Г., якія рашчынялі на жытняй ці ячнай муцэ і замешвалі грэцкай мукой.